УДК 930(437)“1939/1945” DOI 10.52928/2070-1608-2023-66-1-91-95

# СЛАВАЦКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПА ПРАБЛЕМЕ СТАНОВІШЧА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЕЙ У СЛАВАЦКАЙ РЭСПУБЛІЦЫ Ў ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***А.С. КАНДРАЦЕНКА***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)***

*У артыкуле даецца ацэнка славацкай гістарыяграфіі па праблеме становішча нацыянальных меншасцей Славацкай Рэспубліцы ў 1939–1945 гг. Сучасныя гісторыкі акцэнтуюць увагу на раней недаследуемых тэмах, такіх як Славацка-Венгерскае памежжа, выгнанне чэхаў, эвакуацыя карпацкіх немцаў, пазбаўленне ўласнасці яўрэйскай грамады і г.д. Адзначаны найбольш вывучаныя і супярэчлівыя аспекты грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця нацыянальных меншасцей Славакіі перыяду 1939–1945 гг.*

***Ключавыя словы:*** *Славацкая Рэспубліка, славацкая гістарыяграфія, нацыянальныя меншасці, Другая сусветная вайна.*

**Уводзіны.** У апошнія гады назіраецца значная цікавасць з боку славацкіх даследчыкаў да гісторыі нацыянальных мешасцей у Славацкай Рэспубліцы падчас Другой сусветнай вайны. Да 1989 г. гэтае пытанне практычна не разглядалася гісторыкамі. У першую чаргу славацкія даследчыкі звярталі ўвагу на антыфашысцкі рух, ролю камуністаў у Славацкім нацыянальным паўстанні і класавую барацьбу. Сітуацыя змянілася пасля “аксамітнай рэвалюцыі” 1989 г., калі быў ліквідаваны ідэалагічны дыктат КПЧ і адбываўся адыход ад марксісцкай метадалогіі. Вучоныя атрымалі магчымасць працаваць з раней недаступнымі архіўнымі дакументамі, працамі замежных даследчыкаў, у тым ліку славацкіх эмігрантаў, што пасрпыяла росту зацікаўленасці становішчам нацыянальных мешасцей у Славакіі падчас Другой сусветнай вайны.

Становішча і прававы статус этнічных меншасцей ў часы Славацкай Рэспублікі 1939–1945 гг. мелі шэраг асаблівасцей. Прадстаўнікі нямецкай меншасці атрымалі права на пэўную самастойнасць у сваіх дзеяннях, якая праявілася ў стварэнні ўласнай партыі, грамадскіх аб’яднанняў і асобных добраахвотных вайсковых падраздзяленняў. У сваю чаргу славацкія венгры атрымалі ідэнтычныя са славакамі ў Венгрыі правы ў адпаведнасці з т.зв. “прынцыпам узаемнасці”, які быў замацаваны ў Канстытуцыі Славацкай Рэспублікі. Адносіны паміж славацкімі ўладамі і русінскай меншасцю характарызаваліся ўзаемным недаверам. Кіраўніцтва Славакіі падазравала русінаў у супрацоўніцтве з венграмі і лічыла іх прыхільнікамі бальшавізму. Значная частка чэшскага насельніцтва была вымушана пакінуць Славакію пасля ліквідацыі Чэхаславакіі вясной 1939 г. Пражыванне яўрэяў і цыган на тэрыторыі Славацкай Рэспублікі ўспрымалася кіруючым рэжымам як праблема, якая патрабуе хуткага вырашэння. Следствам гэтага стала прыняцце славацкім урадам на працягу 1939–1945 гг. шэрагу пастаноў, якія пазбавілі грамадзянскіх правоў прадстаўнікоў яўрэйскай і цыганскай нацыянальнасці, а таксама выданне афіцыйнага дазволу на дэпартацыю яўрэяў.

**Асноўная частка.** У 1990-я гг. у Славакіі паўстаў шэраг навуковых, адукацыйных, культурных устаноў, супрацоўнікі якіх даследуюць сярод іншага становішча нацыянальных меншасцей у гады Другой сусветнай вайны. Адной з такіх устаноў з’яўляецца Інстытут даследаванняў меншасцей, які знаходзіцца у г. Шаморын [1]. Яго асноўнай мэтай з’яўляецца правядзенне комплексных даследаванняў становішча і культуры нацыянальных меншасцей у Славакіі, а таксама дакументаванне іх спадчыны. Вывучэннем становішча яўрэйскай меншасці займаецца заснаваны ў 2005 г. у Браціславе Цэнтр дакументацыі Халакоста, які выступае партнёрскай арганізацыяй Цэнтральнага саюза яўрэйскіх рэлігійных абшчын Славакіі і супрацоўнічае з рознымі навуковымі ўстановамі краіны і замежжа [2]. Для захавання матэрыяльнай і духоўнай культуры, гістарычнай спадчыны нямецкай меншасці ў 1998 г. быў створаны Музей культуры карпацкіх немцаў, які знаходзіцца ў г. Браціслава. Пры яго падтрымцы выдаюцца працы, прысвечаныя праблеме становішча нямецкай меншасці ў Славацкай Рэспубліцы ў 1939–1945 гг. Адным з буйнейшых цэнтраў, які займаецца гістарычнымі, этналагічнымі і сацыялагічнымі даследаваннямі венгерскай меншасці, з’яўляецца Універсітэт ім. Я. Шэйе ў г. Камарна. Значная частка даследаванняў па праблеме нацыянальных меншасцей таксама прадстаўлена працамі гісторыкаў Славацкай Акадэміі навук, Універсітэта Я.А. Коменскага ў Браціславе, Прэшаўскага ўніверсітэта, Універсітэта Канстанціна Філосафа ў Нітры і інш.

Першыя спробы асэнсавання гісторыі Славацкай Рэспублікі ў 1939–1945 гг., у тым ліку ацэнкі становішча яўрэйскай меншасці, належаць гісторыкам-эмігрантам М. Дзюрыцу і Ф. Внуку. Апошні засяродзіў увагу на разглядзе пытання аб становішчы яўрэйскай меншасці напярэдадні і падчас Славацкага нацыянальнага паўстання (СНП) [3]. На думку аўтара, менавіта пачатак паўстання падштурхнуў нямецкія ўлады да прыняцця рашэння аб поўным знішчэнні яўрэйскай меншасці ў Славацкай Рэспубліцы. Пры гэтым Внук падкрэсліваў, што “нягледзячы на праслед нямецкай паліцыі, славакамі было выратавана каля 20 000 яўрэяў, якія хаваліся сярод славацкага насельніцтва” [3, s. 110]. У сваю чаргу М. Дзюрыца засяродзіў увагу на палітыцы славацкага ўрада ў адносінах да яўрэяў. Ён сцвярджаў, “што прэзідэнт Славацкай Рэспублікі, як і абсалютная большасць членаў урада, не выступалі за праслед ці высяленне яўрэяў са Славакіі, а, наадварот, рабілі ўсё магчымае для абароны яўрэйскай

меншасці" [4, s. 13]. У якасці аргумента Дзюрыца прыводзіў той факт, што пасля прыняцця 15 мая 1942 г. Закона аб высяленні яўрэяў, частка грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці была вызвалена ад дэпартацыі, а на другім этапе дэпартацыі – у 1944 г. – высяленнем кіравалі выключна нацысцкія часткі СС. На думку даследчыка, ад восені 1942 г. да верасня 1944 г. яўрэі знаходзіліся, нягледзячы на існаванне абмежавальных законаў, пад прававой абаронай Славацкай Рэспублікі і не падвяргаліся прымусоваму высяленню.

Дадзенае палажэнне аспрэчвалася ў абагульняючай працы па гісторыі Славакіі, выдадзенай у ЧСФР у 1985 г. [5]. Яе аўтары сцвярджалі, што людацкі рэжым лічыў вырашэнне яўрэйскага пытання адным са сродкаў умацавання свайго палітычнага становішча і аўтарытэту сярод славацкага насельніцтва. З гэтай прычыны заяўленая славацкімі ўладамі арызацыя (комплекс мер па пераводзе яўрэйскай уласнасці ў дзяржаўную ўласнасць – *А.К.*) была заклікана стварыць у Славакіі моцны, палітычна адданы кіраўніцтву клас уласнікаў, пазбаўленых канкурэнцыі з боку яўрэйскай буржуазіі. Навукоўцы адзначалі, што вынікам дзеянняў улад стала тое, што збяднелыя грамадзяне-яўрэі сталі праз пэўны час нязручным сацыяльным цяжарам, ад якога неабходна было пазбавіцца.

Адкрыццё новых архіўных матэрыялаў у 1990-я гг. прывяло да адкідання сучаснымі славацкімі гісторыкамі адзначанага падыходу. Такія даследчыкі, як І. Каменец, Э. Ніжнянскі, Л. Губенак, Л. Ліпшар сыходзяцца ў меркаванні, што падрыхтоўка антыяўрэйскіх мер пачалася яшчэ падчас працы аўтаномнага ўрада Славакіі, а ўжо пасля абвяшчэння незалежнасці Славацкай Рэспублікі ўлады пачалі замацоўваць прынятыя раней рашэнні на заканадаўчым узроўні [6–11]. На думку Каменца, яўрэйскае пытанне было штучна ператворана славацкімі ўладамі ў ключавую ўнутраную праблему дзяржавы, якая стала асноўнай тэмай у барацьбе паміж славацкімі радыкаламі і кансерватарамі. У сваю чаргу, Ніжнянскі прыйшоў да высновы, што антысемітызм у Славакіі быў, перш за ўсё, вынікам мэтанакіраванай палітыкі славацкіх улад у дачыненні да яўрэйскай меншасці, у той час як уплыў Германіі на антысеміцкія настроі славакаў быў пераважна ўскосным і, як мінімум, другасным. Даследчыкі сыходзяцца ў меркаванні, што перамога пасля зальцбургскіх перамоў 1940 г. радыкальнага крыла на чале з В. Тукам і А. Махам паспрыялі радыкалізацыі антыяўрэйскага курсу ў Славакіі, што ў сваю чаргу прывяло да масавых дэпартацый яўрэйскага насельніцтва. Аналіз даследаванняў па дадзенай праблематыцы дазваляе выдзеліць наступныя храналагічныя перыяды ў палітыцы славацкіх улад па вырашэнні яўрэйскага пытання: 1) перыяд аўтаномнай Славакіі (кастрычнік 1938 – сакавік 1939 гг.); 2) ад стварэння Славацкай Рэспублікі (сакавік 1939 г.) да зальцбургскіх перамоў (ліпень 1940 г.); 3) прыход радыкалаў да ўлады і прыняцце Яўрэйскага кодэкса (верасень 1940 г.) да дэпартацыі яўрэйскага насельніцтва (кастрычнік 1942 г.); 4) ад прыпынення дэпартацый да пачатку Славацкага нацыянальнага паўстання (кастрычнік 1942 – жнівень 1944 гг.); 5) ад пачатку паўстання (жнівень 1944 г.) да вызвалення Славакіі (красавік 1945 г.).

Праблема арызацыі ці пазбаўленне ўласнасці яўрэйскай грамады падчас Другой сусветнай вайны таксама выступае прадметам даследавання славацкай гістарыяграфіі апошніх дзесяцігоддзяў. Па меркаванні такіх даследчыкаў, як І. Каменец, Э. Ніжнянскі, Я. Главінка, М. Фіамова, Л. Галон і інш., арызацыя была адным з галоўных інструментаў славацкіх улад па выключэнні яўрэяў з эканамічнага і сацыяльнага жыцця [12–16]. Яе асноўная мэта, на думку спецыялістаў, заключалася ў канфіскацыі яўрэйскай уласнасці і выключэнні яўрэяў як з эканамічнага, так і грамадска-палітычнага жыцця шляхам увядзення абмежаванняў на прафесійную дзейнасць. Па меркаванні Галона, найбольш частай формай арызацыі была ліквідацыя яўрэйскіх прадпрыемстваў [17]. Навукоўцы адзначаюць, што пазбаўленае ўласнасці яўрэйскае насельніцтва стала сацыяльнай праблемай для ўлады, выйсце з якой славацкі ўрад хацеў знайсці з дапамогай саюзніцкай Германіі. У сваю чаргу Ніжнянскі выказвае меркаванне, што славацкі ўрад, пазбаўляючы яўрэяў маёмасці, жадаў тым самым "падкупіць славакаў" і такім чынам пашырыць сацыяльную базу сваіх прыхільнікаў.

Ацэнка грамадска-палітычнага становішча немцаў і вызначэнне ролі ў ім Нямецкай партыі ў Славакіі была дадзена гісторыкамі С. Габздзілавай-Алейнікавай, М. Алейнікам, М. Шварцам, Д. Ковачам і інш. [18–24]. Даследчыкі падкрэсліваюць, што Нямецкая партыя (НП) выконвала ролю палітычнага цэнтра карпацкіх немцаў і адзначаюць яе выключнае права на прадстаўніцтва нямецкай этнічнай групы ў Славацкай Рэспубліцы. Гісторыкі сцвярджаюць, што НП на чале з Ф. Кармазінам імкнулася атрымаць максімальныя льготы з боку кіруючага рэжыму, бо стаўленне ўлад Славацкай Рэспублікі да нямецкай меншасці выступала ў значнай ступені крытэрыем узаемаадносін славацкага ўрада з нацысцкай Германіяй. На думку даследчыкаў, Берлін разглядаў карпацкіх немцаў у якасці агентаў і асведамляльнікаў нямецкіх разведвальных органаў аб сітуацыі ў Славакіі. Па меркаванні Ковача, рашучая падтрымка радыкальнага крыла ГСНП на чале з В. Тукам і А. Махам з боку Нямецкай партыі і асабіста Кармазіна паўплывала на прыняцце славацкім кіраўніцтвам далейшых бескампрамісных грамадска-палітычных рашэнняў у дачыненні да яўрэйскай меншасці. Навукоўцы адзначаюць, што поспехі нямецкай арміі на першых этапах Другой сусветнай вайны і актыўная прапаганда з боку НП прывялі да росту нямецкага нацыяналізму ў Славакіі.

Пытанне эвакуацыі карпацкіх немцаў у Германію пасля пачатку Славацкага нацыянальнага паўстання і вызвалення славацкіх зямель разглядалася ў працах С. Габздзілавай-Алейнікавай, М. Алейніка, Д. Ковача і інш. [18; 19; 25]. Даследчыкі канстатавалі, што набліжэнне Чырвонай Арміі да славацкай мяжы і пашырэнне паўстання выклікалі паніку і страх сярод нямецкага насельніцтва. Стаўленне нямецкай меншасці да эвакуацыі яны характарызуюць, як сапраўдную дылему: з аднаго боку, гэта быў страх перад Чырвонай Арміяй, з другога – нежаданне пакідаць свае дамы. Эвакуацыя, нягледзячы на загады нямецкага кіраўніцтва і вызначаную ім канцэпцыю, праходзіла не па плану і часта суправаджалася затрымкамі ў часе. Даследчыкі прыйшлі да высновы, што пытанне размяшчэння і бяспекі немцаў пасля эвакуацыі са Славакіі не было вырашана, так як асаблівых патрабаванняў да

арганізацыі будучага жыцця карпацкіх немцаў Берлінам не ставілася. Адкрытым застаецца пытанне вызначэння колькасці эвакуіраваных са Славакіі ў 1944 г. карпацкіх немцаў. На сённяшні дзень па ацэнках даследчыкаў іх лічба вагаецца ад 70 да 120 тыс. чалавек [19, s. 42].

На становішча венгерскай меншасці ў Славакіі ў значнай ступені ўплывалі адносіны паміж Браціславай і Будапештам. Гісторык М. Хетэны прыйшоў да высновы, што на славацка-венгерскія міждзяржаўныя адносіны, а, адпаведна, і на становішча славацкіх венграў істотна паўплываў "прынцып узаемнасці" [26; 27]. Гэтае меркаванне падзяляюць і развіваюць О. Падалец і М. Лацко, кажучы аб тым, што славацкі бок чакаў ад венгерскіх калег аналагічнага падыходу да ўрэгулявання розных пытанняў становішча славацкай меншасці ў Венгрыі [28; 29]. "Прынцып узаемнасці" прадугледжваў, што правы этнічных груп, замацаваныя ў Канстытуцыі Славацкай Рэспублікі, прымяняюцца ў той ступені, у якой славацкая меншасць на тэрыторыі метраполіі адпаведнай этнічнай групы карыстаецца такімі ж правамі. У сваіх даследаваннях Хетэны прыходзіць да высновы, што славацкія венгры знаходзіліся ў больш прывілеяваным становішчы ў параўнанні з іншымі меншасцямі (акрамя нямецкай меншасці – *А.К.*). Яны мелі права на стварэнне палітычных аб'яданняў, але, у адрозненні ад карпацкіх немцаў, сутыкаліся з абмежаваннямі з боку славацкіх улад, што перашкаджала паўнавартаснай дзейнасці. З іншага боку, славацкіх венграў практычна не закранула пазбаўленне эканамічных і грамадзянскіх правоў ці прымусовае высяленне. Любая буйная акцыя супраць венгерскай меншасці ў Славакіі фіксавалася Будапештам, што пагражала ўзаемнымі дзеяннямі ў дачыненні да славакаў у Венгрыі.

Згаданы даследчык Хетэны звярнуў увагу і на праблему Славацка-Венгерскага памежжа [30; 31]. Ён адзначаў, што развіццё дзадзенага рэгіёна вызначалася палітыкай нямецкага ўрада і двухбаковымі славацка-венгерскімі адносінамі. Пасля адыходу паўднёвых раёнаў Славакіі да Венгрыі тысячы жыхароў славацкай, чэшскай, яўрэйскай і русінскай нацыянальнасцей былі вымушаны пакінуць сваю зямлю пад ціскам венгерскай улады. Славацка-Венгерскае памежжа на працягу 1939 – 1945 гг. з'яўлялася ачагом канфлікту, які актыўна падаграваўся прапагандысцкімі захадамі абодвух бакоў. Хетэны адзначаў, што для венгерскай прапаганды таго часу было характэрна выкарыстанне перыядычнага друку і вербальнай камунікацыі. Сярод славацкіх венграў памежжа распаўсюджваліся чуткі аб хуткіх тэрытарыяльных зменах на карысць Венгрыі. На думку даследчыка, славацкая прапаганда не саступала Будапешту ў сваёй інтэнсіўнасці, актыўна выкрываючы на старонках перыядычнага друку венгерскую рэвізіяніісцкую палітыку.

Аналіз становішча цыганскай меншасці быў праведзены такімі навукоўцамі як З. Куманава, А. Ман, К. Янас і інш. [32–35]. На іх думку, дыскрымінацыйныя меры ўлад Славацкай Рэспублікі супраць цыган былі прадыктаваны асацыяльнымі паводзінамі дадзенай этнічнай групы. Даследчыкі прышлі да высновы, што даўнія стэрэатыпы аб цыганскай меншасці ў шырокіх слаях насельніцтва, падмацаваныя публікацыямі ў перыядычным друку і сцверджаннямі шэрагу славацкіх навукоўцаў і палітыкаў, знайшлі адлюстраванне ў прававых нормах супраць цыган. У гісторыі пераследу цыган К. Янас вылучыў два перыяды: 1) сакавік 1939 г. – жнівень 1944 г., які характарызаваўся афармленнем антыцыганскага заканадаўства і яго рэалізацыяй на практыцы (цыганаў прымусова перасялялі з гарадоў у вёску, ім забаранілі служыць у войску, наведваць паркі і крамы, з 1941 г. іх пачалі змяшчаць у працоўныя лагеры для асацыяльных асоб); 2) жнівень 1944 г. – красавік 1945 г., калі назіралася ўзмацненне рэпрэсій супраць цыганскай меншасці ў сувязі з дзеяннямі нямецкай арміі на славацкай тэрыторыі. Так, у лістападзе 1944 г. на месцы працоўнага лагера ў Дубніцэ-над-Вагам быў створаны асобны лагер, куды адпраўлялі цыган з усёй Славакіі з членамі іх сем'яў [34].

Асаблівасці побыту чэшскіх служачых у Славакіі падчас Другой сусветнай вайны ў дзяржаўным і прыватных сектарах выявілі гісторыкі П. Мічко і З. Хештэрава [36]. Яны высветлілі, што пасля абвяшчэння аўтаноміі Славацкай Рэспублікі прадстаўнікі ўрада, спасылаючыся на недахоп працоўных месцаў у дзяржаве, запатрабавалі ад чэхаў выехаць з краіны. На змяненне прававога становішча чэшскай меншасці аказала ўплыў і прыняцце Законаў аб грамадзянстве і аб працаўладкаванні замежнікаў, так як апошні ануляваў ранейшыя дазволы на працу. На думку аўтараў, згаданыя змяненні ў славацкім заканадаўстве вымусілі большасць чэхаў пакінуць Славацкую Рэспубліку. Пры гэтым, як высветліў І. Бака, значны ўплыў на высяленне чэхаў аказала высокая актыўнасць членаў Глінкавай гвардыі і афіцыйнай прэсы, якія падагравалі антычэшскія настроі сярод славацкіх грамадзян і выступілі адзіным фронтам у падтрымку рашэння аб выгнанні чэхаў [37].

Становішча русінскай меншасці ў Славацкай Рэспубліцы 1939–1945 гг., на думку даследчыкаў, характарызавалася недаверлівымі адносінамі паміж славацкімі ўладамі і русінамі, якіх стала абвінавачвалі ў венгерскасці, а пазней – у сімпатыях да камуністычнай ідэалогіі. Для палітыкі людацкага рэжыму ў дачыненні да русінскай меншасці былі характэрны асіміляцыйныя захады [38]. Даследчыкі канстатуюць, што намаганні русінаў па стварэнні палітычнага аб'яднання пастаянна ўваходзілі ў супярэчанні не толькі з інтарэсамі сталіцы, але і з асабістымі меркаваннямі асобных мясцовых чыноўнікаў. На думку С. Канечнага, рознага ўзроўню ўлады імкнуліся не толькі мінімізаваць палітычную актыўнасць русінаў, але і цалкам забараніць іх культурна-адукацыйную дзейнасць [39].

**Заключэнне.** Такім чынам, можна канстатаваць, што сучасная славацкая гістарыяграфія па праблеме становішча нацыянальных меншасцей у Славацкай Рэспубліцы ў 1939–1945 гг. прадстаўлена шматлікімі даследаваннямі. Гісторыкі аналізуюць дзейнасць этнічных груп у Славакіі праз прызму іх грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага становішча. Галоўнай асаблівасцю сучасных славацкіх даследаванняў па праблеме нацыянальных меншасцей з'яўляецца зварот да пытанняў, якія раней не разглядаліся: выгнанне чэхаў, славацка-венгерскія адносіны, палітыка антысемітызму ў першай Славацкай Рэспубліцы і г.д. Прыярытэтнае месца ў даследаваннях займаюць пытанні грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця яўрэйскага, нямецкага і венгерскага насельніцтва

тагачаснай Славакіі. У сваю чаргу становішча цыганскай, чэшскай і русінскай меншасцей прадстаўлена фрагментарна. Пэўным недахопам можна лічыць адсутнасць даследаванняў па пытаннях стаўлення нацыянальных меншасцей да славацкіх улад, узаемадзеяння славацкага насельніцтва з рознымі этнічнымі групамі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Fórum inštitút pre výskum menšín. Šamorín. – URL: https://foruminst.sk. (дата звароту: 25.04.2022).
2. Dokumentačné stredisko holokaustu. Bratislava. – URL: http://www.holokaust.sk. (дата звароту: 25.04.2022).
3. Vnuk F. Neuveriteľné sprisahanie, vojenské a politické akcie proti Slovenskej republike v roku 1944. – Middletown: knižnica Literárneho almanachu Slováka v Amerike, 1964. – 196 s.
4. Ďurica M. S. Slovenský podiel na európskej tragédii Zidov. – Köln: Slovenský ústav Matúša Cernáka, 1987. – 40 s.
5. Dejiny Slovenska V / zost. M. Kropilák a kol. – Bratislava: Veda, 1985. – 607 s.
6. Kamenec I. Po stopách tragédie. – Bratislava: Archa, 1991. – 285 s.
7. Kamenec I. Slovenský stát (1939-1945). – Praha: Anomal, 1992. – 143 s.
8. Nižňanský E. Nacizmus, holokaust, slovenský štát. – Bratislava: Kalligram, 2010. – 290 s.
9. Nižňanský E. Politika antisemitizmu a holokaust na Slovensku v rokoch 1938–1945. – Banská Bystrica: Múzeum Slovenského národného povstania, 2016. – 495 s.
10. Hubenák L. Rasové zakonodarstvo na Slovensku (1939–1945). – Bratislava: Univerzita Komenského, 2003. – 224 s.
11. Lipscher L. Židia v slovenskom štáte 1939–1945 [nem. prel. I. Knezlová]. – Bratislava: Print-servis, 1992. – 254 s.
12. Kamenec I. Arizačný proces a jeho vplyv na slovenskú spoločnosť // Obraz a odraz osobnosti modernej doby: k "70" historikov Jana Peška a Stanislava Sikoru. – Bratislava: Veda, 2019. – S. 283–299.
13. Nižňanský E. Arizácie v regiónoch Slovenska / E. Nižňanský, J. Hlavinka (eds.). – Bratislava: Stimul, 2010. – 231 s.
14. Hlavinka J., Fiamová M. Arizácia židovského majetku // Slovenský štát 1939–1945: predstavy a realita. – Bratislava: Historický ústav SAV, 2014. – S. 255–271.
15. Fiamová M. Arizácia pozemkového vlastníctva na Slovensku v rokoch 1939–1945 // Protižidovské zákonodárstvo na Slovensku a v Európe : zborník z medzinárodnej vedeckej konferencie Bratislava 8.-9. septembra 2011. – Bratislava: Ústav pamäti národa, 2014. – S. 281–293.
16. Fiamová M. Slovenská zem patrí do slovenských rúk arizácia pozemkového vlastníctva židovského obyvateľstva na Slovensku v rokoch 1939 – 1945. – Bratislava: Veda, 2015. – 175 s.
17. Hallon L. Arizacia na Slovensku 1939–1945 // Acta Oeconomica Pragensia – 2007. – Roĉ. 15, ĉ. 7. – S. 148–160.
18. Gabzdilová S. Nemecká komunita v živote slovenskej spoločnosti 1938 – 1945 // Človek a spoločnost. – 2004. – Roč. 7, č. 3. – S. 139–151.
19. Gabzdilová-Olejníková S., Olejník M. Karpatskí Nemci na Slovensku od druhej svetovej vojny do roku 1953. – Bratislava: Spoločenskovedný ústav SAV, Slovenské národné múzeum Múzeum kultúry karpatských Nemcov, 2004. – 206 s.
20. Olejník M. Postavenie nemeckej menšiny na Slovensku po porážke nacistického Nemecka. – Človek a spoločnost. – 1998. – roč. 1, č. 2. – S. 14–20.
21. Schvarc M. Heimatschutz – medzi realitou a ilúziou (Organizácia a formovanie nemeckej domobrany) // Slovenská republika 1939 – 1945 očami mladých historikov III. Povstanie roku 1944. – Trnava: Katedra histórie FF UCM Trnava, 2004. – S. 301–327.
22. Schvarc M. "Každý Nemec uvedených ročníkov sa má bez vyzvania dostaviť pred komisie.": Nábor a služba slovenských Nemcov vo Waffen-SS 1939 – 1945. – Bratislava: Historický časopis – 67, 4/2019. – S. 659–693.
23. Schvarc M. Vývoj a zmeny organizačnej štruktúry Deutsche Partei 1938 – 1945 // Historický časopis. – 2006. – № 3(54). – S. 471–503.
24. Kováč D. Nemecko a nemecká menšina na Slovensku (1871–1945). – Bratislava: Veda, 1991. – 235 s.
25. Kováč D. Evakuácia slovenských Nemcov v záverečnej fáze druhej svetovej vojny // Acta contemporanea: k pětašedesátinám Viléma Prečana. – Praha: Ústav pro soudobé dějiny AV ČR, 1998. – S. 147–165.
26. Hetényi M. Postavenie maďarskej menšiny na Slovensku v rokoch 1939 – 1940 // Slovensko medzi 14. marcom 1939 a salzburskými rokovaniami. – Prešov: Universum, 2007. – S. 93–111.
27. Hetényi M. (Zjednotená) maďarská strana na Slovensku 1939–1945. – Nitra: UKF, 2011. – 307 s.
28. Lacko M. Slovenská republika 1939–1945. – Bratislava: Perfekt, Ústav pamäti národa, 2008. – 205 s.
29. Podolec O. Postavenie národnostných menšín v Slovenskej republike (1939–1945) // Z dejín demokratických a totalitných režimov na Slovensku a v Československu v 20. storočí: historik Ivan Kamenec 70-ročný. – Bratislava: Historický ústav SAV, 2008. – S. 115–130.
30. Hetényi M. Propaganda v slovensko-maďarských vzťahoch v rokoch 1938 – 1945 // Forum Historiae. – 2012. – Roč. 6, č. 2. – S. 101–113.
31. Hetényi M. Slovensko-maďarské pomedzie v rokoch 1938 – 1945i. – Nitra: Univerzita Konštantína Filozofa, 2008. – 216 s.
32. Kumanová Z., Mann A. B. Ma bisteren! Nové poznatky o holocauste Rómov na Slovensku. – Bratislava: Občianske združenie in minorita, 2015. – 48 s.
33. Nepriznaný holocaust : Rómovia v rokoch 1939 – 1945 : [v rámci projektu Ma bisteren!] / ed. Z. Kumanová, A. B. Mann. Bratislava: Občianske združenie In minorita. – Slovenské národné múzeum : Ústav etnológie SAV, 2007. – 53 s.
34. Janas K. Perzekúcie Rómov v Slovenskej republike (1939 – 1945). – Bratislava: Ústav pamäti národa, 2010. – 112 s.
35. Janas K. Utrpenie slovenských Rómov // Fenomén holokaustu: zborník z medzinárodnej vedecko-odbornej konferencie konanej dňa 27.-28. marca 2008 pod záštitou predsedu vlády SR pre vedomostnú spoločnosť, európske záležitosti, ľudské práva a menšiny Dušana Čaploviča. – Bratislava: Števt, 2008. – S. 123–133.
36. Mičko P., Hešterová Z. Špecifiká postavenia českých zamestnancov na Slovensku počas druhej svetovej vojny vo verejnom, štátnom a súkromnom sektore // Acta historica Neosoliensia Vedecký časopis pre historické vedy. – 2017. – № 2. – S. 87–104.
37. Baka I. Politický systém a režim Slovenské republiky v rokoch 1939–1940. – Bratislava: Vojenský historický ústav, 2010. – 322 s.
38. Pekár M. Rusínska otázka na Slovensku v rokoch 1939–1945 a alternatívy jej riešenia // Slovenská republika 1939-1945 očami mladých historikov. – Zv. 4. Zborník príspevkov z medzinárodnej vedeckej konferencie Banská Bystrica 14. – 15. 4. 2005. – Banská Bystrica: Ústav vedy a výskumu UMB, 2005. – S. 292–302.
39. Konečný S. Rusínska a ukrajinská menšina po vzniku prvej Slovenskej republiky // Slovenská republika 1939-1945 očami mladých historikov. – Zv. 4. Zborník príspevkov z medzinárodnej vedeckej konferencie Banská Bystrica 14. – 15. 4. 2005. – Banská Bystrica: Ústav vedy a výskumu UMB, 2005. – S. 283-291.

40. Slovensko v 20. storočí. Štvrtý zväzok, Slovenská republika 1939-1945 / K. Hradská, I. Kamenec a autor. kol. – Bratislava: VEDA, 2015. – 477 s.

*Пастуніў 21.10.2022*

**СЛОВАЦКАЯ ИСТОРИОГРАФИЯ ПО ПРОБЛЕМЕ ПОЛОЖЕНИЯ НАЦИОНАЛЬНЫХ МЕНЬШИНСТВ В СЛОВАЦКОЙ РЕСПУБЛИКЕ В ГОДЫ ВТОРОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ**

***А.С. КОНДРАТЕНКО***
***(Белорусский государственный университет, Минск)***

*В статье дается оценка словацкой историографии по проблеме положения национальных меньшинств в Словацкой Республике в 1939–1945 гг. Современные историки акцентируют внимание на ранее неисследованных темах, таких как словацко-венгерскае пограничье, изгнание чехов, эвакуация карпатских немцев, лишение имущества еврейской общины и др. Отмечены наиболее изученные и противоречивые аспекты общественно-политической и экономической жизни национальных меньшинств Словакии периода 1939–1945 гг.*

***Ключевые слова:*** *Словацкая Республика; словацкая историография; национальные меньшинства; Вторая мировая война.*

**SLOVAK HISTORIOGRAPHY ON THE PROBLEM OF THE STATE OF NATIONAL MINORITIES IN THE SLOVAK REPUBLIC DURING THE SECOND WORLD WAR**

***A. KANDRATSENKA***
***(Belarusian State University, Minsk)***

*The article gives an assessment of the Slovak historiography on the problem of the state of national minorities in the Slovak Republic in 1939–1945. Modern historians focus on previously unexplored topics, such as the Slovak-Hungarian borderlands, the expulsion of Czechs, the evacuation of the Carpathian Germans, the deprivation of property of the Jewish community, etc. The most studied and controversial aspects of the socio-political and economic life of the national minorities of Slovakia in the period 1939–1945 are noted.*

***Keywords:*** *Slovak Republic; Slovak historiography; national minorities; The Second World War.*